Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома
Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 26(238) | Пятніца, 25 лістапада 1955 года. | Цана 20 кап.

## ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЯ СЕСІЯ НАБЛІЖАЕЦЦА

Пачынаецца важнейшы перыяд у жыцці ўсіх ВНУ краіны—падрыхтоўка да зімовай экзаменацыйнай сесіі. Сесія будзе справаздачай перад Радзімай аб вучэбнай рабоце.

У гэтым годзе яна будзе праходзіць напярэдадні XX з'езда КПСС. Гэтая велічная падзея ў жыцці нашай партыі і краіны абавязвае кожнага савецкага чалавека павысіць патрабавальнасць да сябе. Калектыў БДУ павінен мабілізаваць усе свае сілы на выкананне задач, пастаўленых партыяй і ўрадам у справе падрыхтоўкі кадраў высокакваліфікаваных спецыялістаў для розных галін навукі і культуры.

Экзаменацыйная сесія — гэта праверка ўсёй нашай работы за справаздачны перыяд. У мінулым навучальным годзе 72 працэнты студэнтаў БДУ здалі веснавую сесію на «добра» і «выдатна» і звыш 20 працэнтаў—толькі на «выдатна».

Аднак гэтыя вынікі не павінны нас супакойваць. Шэраг прыкладаў сведчыць аб тым, што ў вучэбна-выхаваўчай рабоце ёсць буйныя недахопы. У перыяд веснавой сесіі мінулага навучальнага года звыш 200 студэнтаў здалі экзамены толькі на «здавальняюча». Па выніках апошняй сесіі каля ста студэнтаў мелі акадэмічную запазычанасць.

Гэта — зусім недапушчальны брак у рабоце універсітэта. Калектыў БДУ мае ўсе магчымасці дасягнуць поўнай паспяховасці. Для гэтага неабходна дабіцца таго, каб студэнты не абмяжоўваліся толькі вывучэннем падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, а паглыблялі свае веды паўсядзённай работай над навуковай літаратурай, старанна вывучалі рэкамендацыйную літаратуру. У гэтай справе вялікі абавязак кладзецца на нашы прафесарска-выкладчыцкія кадры. Прафесары і выкладчыкі павінны ўважліва сачыць за тым, як студэнты засвойваюць вывучаемы матэрыял, аказваць ім неабходную дапамогу, пастаянна кантраляваць работу сваіх выхаванцаў.

Адказнасць за правядзенне гэтай работы ляжыць на дэканатах і загадчыках кафедраў. Пад іх непасрэдным кіраўніцтвам павінны быць арганізаваны сістэматычныя індывідуальныя і групавыя кансультацыі, складзены і вывешаны спісы рэкамендацыйнай літаратуры па кожнай асобнай тэме. Ва ўсіх кабінетах неабходна арганізаваць дзяжурствы кансультантаў.

Для паспяховага правядзення прадстаячай зімовай экзаменацыйнай сесіі неабходна арганізаваная падрыхтоўка ўсяго калектыва універсітэта. Асаблівая ўвага павінна быць удзелена своечасоваму выкананню вучэбных планаў. Работнікі дэканатаў абавязаны забяспечыць чоткую работу ўсіх супрацоўнікаў факультэтаў. Зараз асабліва важна, каб ні адна хвіліна вучэбнага часу не прападала дарма.

Між тым, гэтай простай ісціны, відаць, не разумеюць асобныя работнікі фізіка-матэматычнага факультэта. У выніку безадказных адносін да справы сакратара факультэта тав. Страдавай, на факультэце мелі месца зрывы заняткаў, блытаніна ў размеркаванні аудыторый. Дрэнна вядзецца на факультэце ўлік выканання педагагічнай нагрузкі. Трэба зрабіць папрок і дэкану факультэта тав. Халімановічу, які не быў патрабавальным да сваіх падначаленых.

Поспех экзаменацыйнай сесіі залежыць ад таго, як будзе наладжан кантроль за работай студэнтаў у акадэмічных групах. Абавязак партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый, дэканаў—звярнуць асаблівую ўвагу на ўмацаванне вучэбнай дысцыпліны, дабіцца таго, каб студэнты выкарыстоўвалі кожную гадзіну для падрыхтоўкі да экзаменаў.

Нажаль, гэтай адказнасці, відаць, не адчуваюць грамадскія арганізацыі і дэканаты юрыдычнага, геолага-геаграфічнага і філалагічнага факультэтаў. Па юрыдычнаму факультэту, напрыклад, 22 чалавекі прапусцілі кожны ў паасобку ад 8 да 28 гадзін заняткаў, па геаграфічнаму—18 чалавек, па філалагічнаму—21 чалавек. Асабліва вызначыліся ў гэтых адносінах студэнты Лабуцін, Бялевіч, Бадзялка (юрфак), Коршун, Доркіна, Калініна, Фурманец (філфак) і інш. Неабходна стварыць у вучэбных групах атмасферу нецярпімасці да гультаёў і прагульшчыкаў.

Да зімовай экзаменацыйнай сесіі засталося паўтара месяца. Дэканам ужо цяпер неабходна падумаць над раскладам залікаў і экзаменаў, склаўшы іх у адпаведнасці з улікам запатрабаванняў студэнцкай масы. Загадзя павінны быць вывешаны графікі кансультацый.

Вялікі абавязак кладзецца і на загадчыкаў кафедраў. Трэба ў бліжэйшыя дні распрацаваць і абмеркаваць на кафедрах экзаменацыйныя білеты. Нецярпіма калі такая адказная справа адкладваецца да пачатку сесіі і вырашаецца наспех. Побач з гэтым неабходна абмеркаваць пытанне аб крытэрыях ацэнкі ведаў. Трэба ацэньваць адказы студэнта не па тым, як ён завучыў тыя або іншыя тэарэтычныя палажэнні, а па яго ўменню звязваць іх з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва, з сучаснасцю. Неабходна дабіцца строгай аб'ектыўнасці ў ацэнцы ведаў студэнтаў.

Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць першакурснікам. Для іх трэба праводзіць дадатковыя кансультацыі. Студэнты старшых курсаў павінны падзяліцца з імі сваім вопытам, дапамагчы ім знайсці найбольш зручныя формы работы.

Адказныя задачы ў гэты перыяд паўстаюць перад партыйнымі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі універсітэта. Толькі пры іх актыўнай дапамозе наш калектыў зможа забяспечыць высокі ўзровень ведаў студэнтаў, паспяхова падрыхтавацца і правесці зімовую экзаменацыйную сесію.

## ЮБІЛЕЙНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

22 лістапада адбылося пасяджэнне Вучонага совета кафедраў гуманітарных навук, прысвечанае юбілейнай даце.

Даклад аб жыцці і творчасці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча зрабіла кандыдат філалагічных навук В. М. Цімафеева. Аспірант А. Кляучэня расказаў аб Міцкевічу—песняру дружбы народаў, а таксама аб тым, як народы свету ўшаноўваюць яго памяць. «Міцкевіч і беларуская літаратура»—гэтай тэме быў прысвечаны даклад аспіранта А. Лойкі.

## НОВЫ САСТАЎ ПРАФКОМА БДУ

Днямі адбылося арганізацыйнае пасяджэнне новага саставу прафкома, выбранага на XV агульнауніверсітэцкай профсаюзнай канферэнцыі.

Старшынёй прафкома выбран **Д. МАРЧАНКА** (студэнт III курса аддзялення журналістыкі). Паміж астатнімі членамі камітэта абавязкі размеркаваны наступным чынам:

Аргмасавая работа—**В. ВАЙТОВІЧ, З. ТКАЧОВА.**
Палітыка-выхаваўчая работа—**Л. ФРЭНКЕЛЬ.**
Вучэбна-навуковая камісія—**І. УСКОЎ, Н. ХОХ, А. БАРОДЗІЧ.**
Культурна-масавая камісія—**А. САДОЎСКІ, М. ЛІСАВЕНКА, В. ЯНОЎСКАЯ, А. ПЕКАРСКІ.**
Жыллёва-бытавая камісія—**А. КАВАЛЬЧУК, Н. АРТЫШУК.**
Аздараўленчая камісія—**Л. ЛЕЎЧЫК.**
Казначэй—**В. РАДЗІОНАЎ.**

# Па універсітэту

## ГУРТКОЎЦЫ ФІЛФАКА ЗА РАБОТАЙ

Вялікая колькасць студэнтаў універсітэта прымае актыўны ўдзел у рабоце студэнцкіх навуковых гурткоў, якія арганізаваны на ўсіх факультэтах. На адбыўшыхся пасяджэннях многія студэнты выбралі тэмы навуковых дакладаў, заслухалі і абмеркавалі некаторыя раней напісаныя даклады.

У гуртку па вывучэнню вуснай народнай творчасці займаецца каля 30 студэнтаў. На першым пасяджэнні большасць гурткоўцаў выбрала тэмы для навуковых дакладаў. Студэнты-першакурснікі П. Казачонак, Л. Лукашонак, А. Акулік і іншыя пачалі распрацоўваць іх.

Цікава праходзяць пасяджэнні і гуртка беларускай літаратуры. На нядаўна адбыўшымся пасяджэнні былі абмеркаваны вершы універсітэцкіх паэтаў Г. Бураўкіна, Р. Барадуліна, В. Зуёнка. З разглядам твораў пачынаючых аўтараў выступілі студэнты Спірыдзёнак, Цвірка, Клышко, Вярцінскі і іншыя. Яны ўказалі аўтарам на рад недахопаў у іх творах, зрабілі шмат заўваг і каштоўных парад. Найбольш высока былі ацэнены вершы В. Зуёнка.

**Б. САЧАНКА.**

## У ДНІ А. МІЦКЕВІЧА

Студэнты V курса аддзялення журналістыкі правялі вечар, прысвечаны жыццю і творчасці А. Міцкевіча. На вечары прысутнічалі студэнты з Польскай народнай рэспублікі, якія ў гэтым годзе паступілі ў наш універсітэт.

Вечары з дакладамі аб Міцкевічу адбыліся таксама на хімічным і гістарычным факультэтах.

* * *

Члены рэспубліканскага таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў—дацэнты нашага універсітэта В. М. Цімафеева і Д. Е. Фактаровіч, студэнт А. Мальдзіс выступілі з шэрагам лекцый аб А. Міцкевічу перад працоўнымі Мінска і рэспублікі.

Лекцыі праслухалі сотні рабочых, калгаснікаў, служачых совецкіх устаноў.

У бліжэйшыя дні ў выдавецтве БДУ імя В. І. Леніна выходзіць брашура выкладчыка кафедры зарубежнай літаратуры нашага універсітэта, кандыдата філалагічных навук В. М. Цімафеевай «Вялікі польскі паэт Адам Міцкевіч».

Брашура выдаецца рэспубліканскім таварыствам па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў. Тыраж выдання—10 тысяч экземпляраў.

* * *

Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпусціла ў свет плакат «Па родных мясцінах Адама Міцкевіча». Аўтар тэкста і укладальнік — студэнт V курса аддзялення журналістыкі нашага універсітэта Л. Мірачыцкі.

Плакат маляўніча аформлены. Тыраж яго—5 тысяч экземпляраў.



**На здымку: выстаўка, прысвечаная А. Міцкевічу.**

## НА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАХ

Цікава і актыўна праходзяць практычныя заняткі на I курсе біялагічнага факультэта. Студэнты Казлова, Пятровіч, Бурко, Анісімава сістэматычна выяўляюць грунтоўныя веды на практычных занятках. Яны хутка і правільна праводзяць доследы ў хімічных лабараторыях, а затым паслядоўча апісваюць ход і вынікі рэакцый. Гэта дапамагае ім у вывучэнні важных хімічных з'яў.

Сістэматычна асвойваюць першакурснікі і працы класікаў марксізма-ленінізма. Высокую ацэнку атрымалі на практычных занятках па асновах марксізма-ленінізма студэнты Карабанава, Фрыд, Лебедзева і многія іншыя.

**В. ШАЛАТОНІН,**
**студэнт I курса біяфака.**

## ЛЕКЦЫЯ АБ АТАМНАЙ ЭНЕРГІІ

15 лістапада шматлікая аудыторыя студэнтаў, выкладчыкаў, аспірантаў нашага універсітэта праслухала цікавую лекцыю на тэму: «Пытанні біялогіі на Жэнеўскай канферэнцыі па мірнаму выкарыстанню атамнай энергіі». Чытаў лекцыю ўдзельнік канферэнцыі, прафесар Т. Н. Годнеў.

Прысутныя задавалі дакладчыку шмат пытанняў.

**А. СЯРГЕЕЎ.**

## ГІСТОРЫЯ ПРАВАЛАЎ ЭДУАРДА ЧЫКАНОВІЧА

Больш года прайшло ўжо з той пары, калі Эдуард з групай аднакурснікаў упершыню ўвайшоў у аудыторыю універсітэта, уважліва, не прапускаючы ніводнага слова прафесара, слухаў і канспектаваў першую ў жыцці лекцыю.

На перапынку, усхваляваны і радасны, ён падышоў да стаяўшых на калідоры студэнтаў другога курса фізіка-матэматычнага факультэта (аддзялення матэматыкі)) Міхаіла Чыгіра, Эмы Шэўцовай, Вальдэмара Шумскага (цяпер студэнты трэцяга курса).

— Парайце, таварышы, — звярнуўся да старшакурснікаў Эдуард, —як трэба працаваць цяпер, каб добра здаць экзамены ў зімовую экзаменацыйную сесію. Уперадзе-ж у мяне яшчэ чатыры месяцы вучобы.

— Працаваць? Чатыры месяцы? —недаверліва перапытаў першакурсніка Міхаіл Чыгір і ўнушальна дадаў: «Ды ты за чатыры дні падрыхтуешся».

Пасля гэтага таварышы рэдка бачылі Эдуарда Чыкановіча на лекцыях. Не рыхтаваў ён і дамашніх заданняў.

І вось прышла зімовая экзаменацыйная сесія. Зноў, як калісьці ў верасні, стаялі на калідоры Эма Шэўцова, Міхаіл Чыгір, Вальдэмар Шумскі. І зноў да іх падышоў студэнт першага курса аддзялення фізікі Эдуард Чыкановіч.

— Як экзамен па фізіцы, Эдуард?—звярнулася да яго Шэўцова.

— Праваліў,—апусціўшы галаву адказаў Эдуард, і злосна паглядзеў на Чыгіра.

— А як у цябе, Міхаіл?

— Таксама, — паспрабаваў усміхнуцца той.—Але я перакананы, — працягваў Міхаіл, — што правал экзамена па матэматычнаму аналізу проста выпадковы. Да кожнага экзамена двух мінулых сесій я рыхтаваўся 3—4 дні і здаваў як-небудзь...

— Так, гэта выпадкова, — пацвердзілі Шэўцова і Шумскі.

— І мой правал выпадковы,— сказаў Эдуард.

Прышла вясёлая, сонечная вясна. Нярадасна было толькі на душы ў Эдуарда: разам з вясной прышла экзаменацыйная сесія, у час якой ён зноў праваліў экзамен па фізіцы, які, дарэчы, здаў толькі ў гэтым годзе, будучы ўжо студэнтам другога курса. На гэты раз Эдуард ужо не хацеў сустракацца са знаёмымі яму і нам старшакурснікамі. Але аднойчы выпадкова ён даведаўся; што Міхаілу Чыгіру «не пашанцавала» і ён зноў праваліў экзамен. А Шэўцова і В. Шумскі па два экзамены «выпадкова» здалі на «нездавальняюча».

Выпадак з Эдуардам Чыкановічам, нажаль, не адзіны ў нашым універсітэце. Першакурснікі часта атрымліваюць ад студэнтаў старшых курсаў парады аб тым, быццам да экзаменаў можна падрыхтавацца за 3—4 дні, перастаюць сістэматычна працаваць і, як правіла, заўсёды правальваюць.

Хочацца перасцерагчы студэнтаў першых курсаў ад падобных парад.

**В. ПАЎЛОВІЧ.**

**ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ**

# УЗНЯЦЬ УЗРОВЕНЬ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ

Захаванне ўзорнага парадку ў партыйнай гаспадарцы — важны ўчастак арганізацыйнай работы. Сакратары партыйных арганізацый факультэтаў павінны праяўляць клопаты аб узорным парадку партыйных спраў — гэта элементарнае патрабаванне партыйнай дысцыпліны. Партыйныя справы дапамагаюць правільна весці ўлік работы і з'яўляюцца асновай для праверкі выканання.

У склад асноўнай дакументацыі факультэцкіх партыйных арганізацый павінны ўваходзіць наступныя матэрыялы: 1. Планы работы партыйнай арганізацыі; 2. Пратаколы партыйных сходаў, 3. Пратаколы пасяджэнняў партбюро; 4. Матэрыялы па ўчоту камуністаў, і 5. Планы работы камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый факультэта, а таксама даныя аб камсамольскім і прафсаюзным актыве і інш.

План работы павінна мець кожная партыйная арганізацыя. План — не фармальнасць. Ён неабходны для паўсядзённай работы данага калектыву. Але галоўнае заключаецца не ў тым, каб скласці добры план работы, а ў рэалізацыі пытанняў, прадугледжаных гэтым планам, ацэнкай якога могуць служыць толькі практычныя вынікі.

План работы рэкамендуецца зацвярджаць на партсходзе, каб прыцягнуць увагу камуністаў да задач, што стаяць перад партыйнай арганізацыяй факультэта. Акрамя таго вельмі важна ўлічыць заўвагі камуністаў па гэтаму плану.

План павінен складацца з 3-х раздзелаў: пасяджэнні партбюро, партсходы, партыйныя даручэнні. Акрамя гэтага рэкамендуецца мець індывідуальны рабочы план сакратара партбюро.

У план партарганізацыі ўключаюцца пытанні партыйна-арганізацыйнай і партыйна-палітычнай работы. Пры планаванні галоўнае месца адводзіцца мерапрыемствам, якія забяспечваюць высокі ўзровень палітыка-выхаваўчай работы, нармальны вучэбны працэс, комплекснае вырашэнне навуковых праблем. У плане партарганізацыі павінны знайсці адлюстраванне крытычныя заўвагі, якія выказваюць камуністы на справаздачных і іншых партсходах.

Тым не менш, ва ўмовах нашага універсітэта маюць месца несур'ёзныя адносіны да важнейшага мерапрыемства — партыйнага сходу. Так, напрыклад, справаздачна-выбарчы сход на геолага-геаграфічным факультэце быў праведзен на нізкім арганізацыйным узроўні. Былы сакратар тав. Акінчыц не падрыхтаваўся да справаздачы. У яго дакладзе адсутнічалі крытыка і аналіз работы партарганізацыі факультэта. Тав. Акінчыц таксама нічога не сказаў аб задачах, што стаяць перад партыйнай арганізацыяй. Натуральна, што пры такіх умовах на сходзе не была разгорнута крытыка і самакрытыка недахопаў. Такія фармальныя адносіны да справаздачна-выбарчага сходу зусім недапушчальны.

Другі прыклад. На біёлага-глебавым факультэце партыйны сход не праводзіцца ўжо трэці месяц (з 10 верасня). Такое планаванне нельга прызнаць нармальным. Члены партбюро факультэта, у прыватнасці сакратар тав. Палілаў, у далейшым не павінны мірыцца з гэтым становішчам. Трэба зразумець, што пры такой пастаноўцы пытання перш за ўсё парушаецца прынцып унутрыпартыйнай дэмакратыі.

Партыйныя сходы павінны праводзіцца не радзей аднаго разу ў месяц, як гэта прадугледжана ў Статуце КПСС. Зрыў тэрмінаў правядзення партыйных сходаў — адно з праяўленняў парушэння ўнутрыпартыйнай дэмакратыі.

Чарговыя пасяджэнні партбюро рэкамендуецца праводзіць два разы ў месяц. Але можа ўзнікнуць неабходнасць правядзення і нечарговага пасяджэння. Не трэба перагружаць павестку дня; у яе неабходна ўключаць пытанні, загадзя падрыхтаваныя і прадуманыя.

У плане партыйнай арганізацыі павінна знайсці месца важнейшае мерапрыемства — праверка выканання рашэнняў. Сакратар партбюро абавязан на кожным сходзе дакладваць камуністам аб выкананні рашэнняў папярэдняга сходу. Для дзейснай праверкі выканання неабходна прыцягваць шырокія партыйныя масы. Аб рабоце партыйнай арганізацыі трэба меркаваць не толькі па планах, а галоўным чынам па тым, як практычна выконваюцца намечаныя мерапрыемствы.

А між тым, кантроль за выкананнем рашэнняў — слабае месца ў рабоце партарганізацыі.

У плане неабходна прадугледзець пытанні партыйных даручэнняў і іх выкананне. Даручэнні камуністам даваць дыферэнцыравана, з улікам узроўню іх падрыхтоўкі і здольнасцей. Такі падыход будзе садзейнічаць росту членаў і кандыдатаў партыі, праверцы іх дзелавых якасцей. Абавязкова дабіцца такога становішча, каб у актыўную грамадскую работу былі ўцягнуты ўсе камуністы. Выхоўваць камуністаў неабходна ў духу высокай адказнасці за даручаную справу, таму і рэкамендуецца выносіць на партбюро іх справаздачы аб грамадскай і вытворчай рабоце.

У план партыйнай арганізацыі ўключаць работу масавых арганізацый — камсамольскай, прафсаюзнай і іншых не трэба. Партыйная арганізацыя імі паўсядзённа кіруе, але камсамольскія і прафсаюзныя работнікі абавязаны самі планаваць сваю работу, зыходзячы з плана партыйнай арганізацыі.

У дадатак да плана партыйнай арганізацыі неабходна мець спецыяльны план палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай работы факультэта. Ён складаецца на семестр, грунтуючыся на планах партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый. Семестравы план па факультэту складаецца сумесна з дэканатам і партбюро пры ўдзеле камсамольскага і прафсаюзнага актыву.

Парткому універсітэта мэтазгодна было-б праводзіць рэгулярныя рэйды па праверцы выканання планаў факультэцкімі арганізацыямі. Разам з тым, трэба аказваць рэальную дапамогу сакратарам і членам партбюро ў складанні планаў, а галоўнае— праводзіць іх у жыццё. Небходна таксама наладзіць пастаянны абмен вопытам работы факультэцкіх партыйных арганізацый як праз друк універсітэта, так і ў парадку пастаноўкі справаздач сакратароў на пасяджэннях парткома з прыцягненнем партыйнага актыву.

У далейшым неабходна ўсямерна развіваць і павышаць узровень арганізацыйна-партыйнай работы ва універсітэце. Пры гэтых умовах партыйная арганізацыя дабʼецца значных поспехаў у вырашэнні адказных задач, што стаяць перад універсітэтам.

**О. Н. АНДРУШЧАНКА,**
**нам. сакратара парткома БДУ.**

## Лектарская група БДУ

**Пры камітэце камсамола БДУ створана лектарская група. Распрацавана тэматыка лекцый.**

**Днямі на пасяджэнні лектарскай групы была абмеркавана лекцыя «Маральнае аблічча савецкага студэнта», якую падрыхтаваў студэнт Вайтовіч. Члены групы тт. Сліж, Сцепаненка, Пятрэнка, Саўчанка, Міхайлава і іншыя ў сваіх выступленнях пры аналізе лекцыі адзначылі, што лекцыя т. Вайтовіча багата цікавымі фактамі і думкамі.**

**У гэтым навучальным годзе студэнты-лектары прачытаюць на факультэтах лекцыі на самыя рознастайныя тэмы: аб жыцці і творчасці выдатных мастакоў, кампазітараў і пісьменнікаў, аб дружбе і каханні, аб маральным абліччы, аб прыгажосці чалавека і іншыя.**

**А. СТАРАСВЕЦКІ,**

*Пісьмы ў рэдакцыю*

## ДЫПЛОМЫ БЕЗ МАТЭРЫЯЛАЎ

Дыпломная практыка, акрамя багатага практычнага вопыту, павінна даць студэнту не менш багаты матэрыял для напісання дыпломнага праекта. Таму на практыку студэнт-дыпломнік павінен ехаць з дакладным і ясным уяўленнем аб той рабоце, якую яму прадстаіць правесці, з цвёрдым веданнем сваіх задач.

Іменна ад гэтай апошняй практыкі студэнт павінен узяць усё, што дапаможа яму стаць поўнацэнным спецыялістам. Так уяўлялі практыку мы, студэнты. Добрае правядзенне практыкі патрабуе дакладнай яе арганізацыі і кіраўніцтва з боку кафедр. Рэчаіснасць, аднак, абвергла нашы ўяўленні.

Перад ад'ездам на практыку быў сабран якісьці сход. З прычыны таго, што аб сходзе не было аб'яўлена, многія студэнты ўжо выехалі, а другія былі заняты зборамі. Ад'язджаючы на практыку, некаторыя студэнты нават не ведалі сваіх кіраўнікоў.

Што рабіць на практыцы? Які збіраць матэрыял? Аб гэтым не было дакладнага і яснага ўяўлення.

Пакідаючы універсітэт, мы цвёрда помнілі толькі адно: трэба прывезці пабольш узораў і білеты для апраўдання выдаткаваных грошай.

Студэнты раз'ехаліся.

Ва універсітэце стала спакойна. Студэнты далёка і не надакучаюць выкладчыкам. Праўда, у апошніх часамі загаворвала сумленне аб тым, што яны абяцалі пабываць у студэнтаў, паглядзець, дапамагчы, параіць. Але паспрабуй злавіць студэнтаў, калі яны, як вецер, носяцца па палях. І думаюць нашы выкладчыкі: «Ці не паслаць студэнтам дадатковыя інструкцыі па збору матэрыялу на пераддыпломнай практыцы? Не бяда, што яны не атрымалі асноўных інструкцый..» І паслалі!

Студэнты, што праходзілі практыку ў Беларусі (а іх амаль палавіна), не змаглі сабраць матэрыял для дыплому: тыя работы, якія праводзіліся ў Беларусі, наогул не адпавядаюць патрабаванням, прад'яўляемым да нашай пераддыпломнай практыкі. Мы не змаглі пазнаёміцца тут ні з горнымі работамі, ні з механічным бурэннем.

Прайшоў месяц заняткаў, выкладчыкі нешта робяць, нешта прыдумваюць, каб даць нам магчымасць напісаць дыплом. Але справа не кранулася з месца. Акрамя таго няма пакоя, дзе-б маглі займацца дыпломнікі, няма шліфавальных станкоў і нават няма кіраўнікоў дыпломных праектаў.

У дыпломе, як у фокусе, збіраюцца ўсе нашы веды. Пакуль фокус расплывучаты. А трэба, каб ён быў дакладным.

**М. МАГІЛЕВІЧ,**
**В. ДЭЙКО,**
**Р. КРЫВАДУБСКІ,**
**А. ВАХОЎСКІ.**

## ПАВЕТРУ І ВАДЗЕ—СВАБОДУ

«Сонца, паветра і вада — нашы лепшыя сябры!» Каму не вядомы гэтыя словы з песні? Нам здаецца, што толькі работнікам гаспадарчай часткі універсітэта.

Што датычыцца сонца, то яно не падначалілася ўладзе апошніх.

А вось паветра і вада аказаліся ў ролі падначаленых.

Ужо колькі гадоў у спартыўных залах няма вентылятараў. Свежаму паветру тут уваход строга забаронен! А як яно патрэбна нам — спартсменам. Пазбаўлены мы магчымасці і прыняць душ пасля трэніроўкі. Аказваецца, і вада строга нарміравана ў нас ва універсітэце.

Хочацца, каб гэтыя ісціны зразумелі душой і сэрцам т. Бярэзін і некаторыя іншыя.

Тады і паветра, і вада будуць свабодна цыркуліраваць там, дзе іх чакаюць з такім нецярпеннем.

**Пісьмо падпісалі 22 студэнты-спартсмены.**

## ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

«Калі адсутнічае пачуццё адказнасці»—пад такім загалоўкам у № 24 нашай газеты быў змешчан артыкул, у якім крытыкаваліся паводзіны ўдзельнікаў драматычнага калектыву. На пасяджэнні рэктарата разглядаліся факты, аб якіх гаварылася ў нашым артыкуле. Рэктарат вынес наступнае рашэнне:

Студэнтаў В. Внукава, Э. Глебка і Р. Маленчанка выключыць з універсітэта.

Аспіранту Л. Тамільчыку, студэнтам Г. Кандрашовай і Е. Гаркаваму абʼявіць строгую вымову.

Кіраўніку драматычнага калектыву К. Л. Рутшэйну за няправільнае выхаванне членаў драмкалектыву, дапушчэнне заганнай практыкі калектыўных п'янак і асабісты ўдзел у іх—абʼявіць строгую вымову.




У гэтым годзе геолагі III курса павінны былі праходзіць сваю першую вытворчую практыку. Упершыню нашы студэнты раз'ехаліся ў розныя куткі Саюза: ў Куйбышэўскую вобласць, на Украіну, на поўдзень Беларусі, на Урал.

Я і некалькі маіх аднакурснікаў былі ўключаны ў састаў уральскай геалагічнай экспедыцыі. Задачай экспедыцыі было азнаямленне з найбольш цікавымі месцанараджэннямі карысных выкапняў Урала і адбор узораў для камплектавання аддзела карысных выкапняў нашага мінералагічнага музея.

Нам прадстаяла ў агульнай складанасці праехаць каля 10 тыс. кіламетраў, наведаць 60 месцанараджэнняў на поўночным, сярэднім і поўднёвым Урале.

І вось Урал. Засталіся ззаду Мінск, шумная, многалюдная Масква і вялікая Волга. Поезд пятляе па схілах гор, пакрытых густым, хвойным лесам.

Салікамск сустрэў нас белымі начамі і мноствам машкары. Горад размешчан на левым беразе ракі Усолкі, вада ў якой мае марскі прысмак. У Салікамску пабывалі на буйнейшым у Саюзе калійным камбінаце, аглядзелі старажытныя будовы вотчыны Строганавых, пабывалі ў краязнаўчым музеі. Асабліва нас цікавілі матэрыялы аб Ермаку. Адсюль, з Салікамска, пачаў ён свой пераможны шлях заваявання Сібіры. Пасля адбору і адпраўкі ўзораў калійных солей мы накіраваліся праз Молатаў, Кунгур, Первауральск на Свердлоўск. Па дарозе наведалі рад месцанараджэнняў даламіта, гіпса-сіленіта, медзі, тытана, магніта, храміта. Наведалі выдатную Кунгурскую пяшчэру ў Кунгуры, у Красным Ясыле знаёміліся з работай уральскіх «умельцаў»—рэзчыкаў па каменю.

У Свердлоўску мы крыху адпачылі, і пачалася самая цяжкая і самая важная частка нашага маршрута — «Поўночная пятля». Тут мы наведалі месцанараджэнні медзі, азбеста, магнезіта, нікеля, пабывалі на выдатным золатарудным месцанараджэнні, месцанараджэнні каштоўных каменняў. Надвор'е мала спрыяла нам— увесь час ліў дождж. Часта цэлымі днямі даводзілася ехаць праз густы лес, што складаўся з бярозы, піхты, лісцвеніцы і кедру.

Поўднёвы Урал сустрэў нас сонечным, цёплым надвор'ем. Першы прыпынак быў у выдатным Ільменскім запаведніку. Гэта адзіны ў свеце куток прыроды, дзе на невялікай параўнаўча плошчы сканцэнтраваны розныя горныя пароды і дзесяткі мінералаў—ад звычайных, часта сустракаемых, да найскладанейшых па свайму хімічнаму саставу. Зараз нам вядома 145 мінералаў, з іх 30 упершыню на зямным шары знойдзены ў Ільменьскіх гарах.

Яшчэ з даўніх часоў Ільмены вядомы як рэдкая «кладоўка». Тут здабываліся выдатныя уральскія самацветы. Помнікамі тых часоў засталіся старыя капальні, раскіданыя па ўсёй тэрыторыі запаведніка. Іх налічваюць больш за 150.

Распрацоўкі горных багаццяў Ільмен вяліся па-грабежніцку, па-зладзейску. Толькі ў гады Савецкай улады гэтая уральская скарбніца была ўзята пад ахову дзяржавы. Спецыяльным дэкрэтам ад 14 мая 1920 г. СНК СССР за подпісам В. І. Леніна пастанавіў аб'явіць Ільменскія горы Дзяржаўным мінералагічным запаведнікам. Цяпер тут працуе вялікі калектыў навуковых работнікаў, якія вывучаюць багацці Ільменскіх гор.

Ільменскія горы і прымыкаючыя да іх месцы надзвычай жывапісныя. З вяршыні Ільмен-Тау адкрываецца цудоўны краявід на дзесяткі кіламетраў вакол, на азёры Вялікай і Малой Кісегач, Чэбаркуль, Аргаяш, Міасова і інш. На поўнач ад Ільмен-Тау цягнецца зялёная града Ільменскіх гор, на поўдзень цямнеюць горы Поўднёвага Урала, на захадзе ўзнімаюцца вяршыні Урал-Тау, а далёка на ўсход рассцілаецца вялікая Сібірская раўніна.

Правёўшы ў запаведніку 5 дзён, мы працягнулі наш маршрут на поўдзень. «Поўднёвую стралу», куды ўваходзілі месцанараджэнні гары Магнітнай, Сібая, Хрусталя і раду іншых, мы апрацоўвалі амаль да канца нашай практыкі. Тут мы таксама бачылі вельмі многа цікавага, пазнаёміліся з багацейшымі месцанараджэннямі хрусталя, жалеза, медзі. Лепшыя ўзоры гэтых парод былі адпраўлены намі ў Мінск.

Усюды, дзе мы толькі спыняліся, нам, пасланцам Беларусі, аказвалі самы цёплы прыём, знаёмілі нас з гісторыяй гэтага багацейшага краю, і прымалі самы гарачы ўдзел у нашым паўсядзённым жыцці.

**Г. ДАМІНІКОЎСКІ,**

# 1855 Вялікі польскі паэт Адам Міцкевіч 1955

> *Міцкевіч „Барацьбу за незалежнасць Польшчы, усю сваю бязмежную аддданасць справе нацыянальнага вызвалення... неразрыўна звязаў з барацьбой за сацыяльнае вызваленне, з перамогай сацыяльна-вызваленчай барацьбы іншых народаў, з перадавымі грамадскімі ідэямі“.*
>
> **Б. БЕРУТ**

## НЕЎМІРУЧАЯ СПАДЧЫНА

Жыццё, творчасць і грамадска-палітычная дзейнасць вялікага польскага паэта-рэвалюцыянера Адама Міцкевіча прыцягваюць да сябе ўвагу шматлікіх даследчыкаў у розных краінах свету. Але нягледзячы на тое, што работа па вывучэнню спадчыны Міцкевіча вядзецца ўжо звыш стагоддзя, многія важныя пытанні, звязаныя з ёю, не атрымалі да гэтага часу належнага навуковага асвятлення. Справа ў тым, што рэакцыйнае буржуазнае літаратуразнаўства і крытыка імкнуцца вытравіць з твораў Міцкевіча іх пякучы сацыяльны змест, пазбавіць іх баявога рэвалюцыйнага духу, заглушыць праходзячыя праз усю творчасць паэта матывы палымянага выкрыцця дэспатызму і сацыяльнага ўціску, матывы барацьбы за дружбу і рэвалюцыйны саюз паміж народамі.

Зусім інакш ставяцца праблемы класічнай спадчыны ва ўмовах сацыялізма. Тут яна набывае новае жыццё і ўсеагульнае прызнанне. Вучоныя і літаратуразнаўцы Савецкага Саюза і краін народнай дэмакратыі, а таксама прагрэсіўныя зарубежныя даследчыкі, працуючыя над вывучэннем творчай спадчыны Адама Міцкевіча, раскрываюць непераходзячае значэнне яго творчасці для працоўнага чалавецтва, дапамагаюць народам глыбей пазнаць і лепш ацаніць сваё духоўнае багацце.

Распрацоўку адной з праблем спадчыны Міцкевіча — яго грамадска-палітычных поглядаў — я паставіў мэтай сваёй кандыдацкай дысертацыі. Па выкананню гэтай работы мною ўжо зроблены першыя крокі. Вялікую дапамогу аказваюць мне дарагія таварышы з Народнай Польшчы—студэнты нашага універсітэта В. Юзвюк, Э. Гжандзеля і іншыя. Дзякуючы ім, я набыў творы Міцкевіча ў арыгінале, — у тым ліку дзесяць тамоў юбілейнага выдання твораў паэта, якое ажыццяўляецца на яго радзіме, а таксама некалькі кніг аб жыцці і творчасці Міцкевіча.

Перачытваючы сёння творы Адама Міцкевіча, я зноў і зноў адчуваю моц яго творчасці, прыгажосць і сілу польскай мовы, атрымліваю велізарную эстэтычную асалоду. Я ўспамінаю выдатныя строфы «Оды да маладосці» і ўрыўкі з «Пана Тадэуша», якія я вывучыў напамяць яшчэ ў 10-гадовым узросце. Але раней, ва ўмовах панскай Польшчы, я, як і мае сябры з рабочых і сялянскіх сем'яў, не мог карыстацца ўсім багаццем творчасці Міцкевіча і іншых польскіх пісьменнікаў-класікаў. Толькі Савецкая ўлада стварыла нам, дзецям працоўных былой Заходняй Беларусі, усе магчымасці для вывучэння творчасці нашага любімага паэта. Толькі перамога народнай улады ў Польшчы зрабіла творы Міцкевіча здабыткам шырокіх народных мас. Надышоў той час, аб якім марыў вялікі паэт. Кнігі яго чытаюць і пад дахамі гарадскіх камяніц, і пад вясковымі стрэхамі.

**Аспірант А. КЛЯЎЧЭНЯ.**

## ГОНАР СУСВЕТНАЙ ПАЭЗІІ

У 1955 годзе адзначаюцца знамянальныя гадавіны Андэрсена, Шылера, Сервантэса, Уітмэна і Міцкевіча, што — як падкрэсліў Сусветны Савет Міру — «дазваляе народам аб'яднацца, нягледзячы на граніцы, каб аддаць належнае тым пісьменнікам, мастакам або вучоным, якія ўзбагацілі іх агульны здабытак».

Няма ў польскай літаратуры больш значнага імя, чым імя Адама Міцкевіча, які, паводле слоў А. М. Горкага, «выявіў дух народа з найбольшай прыгажосцю, сілай і паўнатой».



Міцкевіч нарадзіўся на Навагрудчыне, у Беларусі, і хоць называў сваю радзіму «Літвою», але працоўны люд, сярод якога ён жыў, быў беларускім. З захапленнем слухаў ён народныя казкі і песні. Рамансы і балады юнака-паэта адзначаны падзагалоўкамі «з народнай песні», «з літоўскага», «украінская балада».

Ужо юнацкая «Ода да маладосці» Міцкевіча адыграла ролю гімна цэлага пакалення. Падхопліваючы шылераўскі вокліч «старое гіне», Міцкевіч тут пісаў:

> «Здравствуй, ранняя зорька свободы!
> Солнце спасенья грядет за тобою!»

У паэме «Гражына» Міцкевіч малюе літвінку-патрыётку, якая палічыла за лепшае памерці, чым марнець пад пятой ворага. Вобраз Гражыны—адзін з выдатных вобразаў еўрапейскай паэзіі рэвалюцыйнага рамантызма.

Сапраўдная народнасць і шчыры лірызм зборніка «Балады і рамансы» знаходзяцца ў цяснейшай сувязі з праходзячым праз увесь зборнік матывам пратэсту супраць прыгонніцтва, пратэсту, які патрабаваў ад польскага паэта пачатку XIX стагоддзя вялікай смеласці.

Пяцігадовае прабыванне вялікага польскага паэта ў Расіі з'явілася школай палітычнай барацьбы і паглыблення эстэтычных поглядаў. І. Казлоў тонка заўважыў Одынцу — сябру Міцкевіча: «Узялі мы яго ў вас моцным, а вяртаем магутным!»

У Расіі Міцкевіч узняў сцяг нацыянальна-рэвалюцыйнай паэзіі яшчэ вышэй стварэннем паэмы «Конрад Валенрод», якая акрыляла многіх патрыётаў паўстання 1830—31 гг. Вялікі польскі паэт бачыў выратаванне айчыны не ў адасабленні, а ў еднанні з народамі Еўропы, якія змагаюцца супраць тыранаў.Міцкевіч пераканана шукае ў свабодзе для свайго народа прагрэсу для чалавецтва. Змагаючыся супраць прапаведзей як нацыяналістаў, так і касмапалітаў. Міцкевіч быў адным з тварцоў рэвалюцыйна-дэмакратычнага лозунга—«За вашу і нашу свабоду». Пушкін успамінаў:

> ... Он говорил о временах грядущих,
> Когда народы, распри позабыв,
> В великую семью соединятся...»

Гэта і зрабіла Міцкевіча, па словах Берута, вялікім рэвалюцыянерам Польшчы.

У «Дзядах» самасвядомасць паэта «ўяўляла сабой, паводле слоў А. М. Горкага, як бы туга скручаную хартыю, якая спісана ўражаннямі гістарычнага быцця яго племені, яго продкаў». «У голасе гэтых продкаў,— як адзначаў паэт,—можна было ўлавіць пэўныя маральныя імкненні і пэўную ідэю, вобразна перададзеную простым людам». Па думцы сучаснага польскага літаратуразнаўцы М. Яструна, гэтаму абраду Міцкевіч надаў агульначалавечае значэнне. Паказальна, што з часам паэт, пачаўшы з успамінаў аб сябрах-філарэтах, арыштаваных у 1823 годзе, украпліваё ў свой расказ і пафасна-драматычныя сцэны-ўражанні ад сустрэч з рускімі рэвалюцыянерамі і, нарэшце, водгукі на польскае паўстанне 1830 — 1831 гг.

Завяршэннем паэтычнай дзейнасці Міцкевіча з'явілася яго паэма «Пан Тадэуш», задуманая першапачаткова як ідылія ў духу гётэўскай «Германа і Даратэі». Гэта «цудоўнейшая рэч», па словах Гогаля. У ёй немалое месца займае і пэўнае любаванне сеймамі і сеймікамі,некаторая эстэтызацыя апошніх экземпляраў шляхты. Аднак, як адзначае М. Рыльскі, вялікі паэт Польшчы разумее цану гэтых бакоў яе жыцця, бачачы ў іх адыходзячую ў мінулае Польшчу. Блізкі сябра Герцэна рэвалюцыйны дэмакрат Ворцэль назваў паэму помнікам, «пакладзеным рукой генія на старую шляхецкую Польшчу».

Пасля «Пана Тадэуша» Міцкевіч пакінуў занятак паэзіяй для гісторыі, публіцыстыкі і літаратуразнаўства. Адным з першых Міцкевіч распрацаваў курс лекцый па гісторыі славянскіх літаратур і звярнуў увагу мыслячай Еўропы на іх своеасаблівасць.

У сваіх лекцыях, змяшчаўшых супярэчлівыя сцверджанні аб месіянстве польскай нацыі. Міцкевіч дазволіў сабе асуджэнне афіцыяльнага каталіцтва, і чытанне іх было спынена французскім урадам. Але Міцкевіч не адклаў пяра ў бок: «Жыву адной надзеяй, — пісаў ён, — не лягу ў труну з бяздзейна складзенымі рукамі».

Рэвалюцыйны ўздым 1848 года дапамог Міцкевічу, як і многім буйным еўрапейскім паэтам, перамагчы сумненні, вызваліцца з-пад уплыву містыкі Тавянскага.

Паэт фарміруе ў Італіі польскі легіён і ў супярэчлівейшых «Кнігах народа польскага і пілігрымства польскага» імкнецца ўказаць патрыётам Польшчы іх інтэрнацыянальны абавязак: «дзе толькі ёсць прыгнечанне свабоды ў Еўропе і барацьба за свабоду. там ідзе барацьба за радзіму, і ў гэтай барацьбе абавязаны змагацца ўсе».

Міцкевіч стварае і рэдагуе орган польскай рэвалюцыйнай дэмакратыі—газету «Трыбуна народаў», у якой выкрывае еўрапейскую рэакцыю і прапагандуе ідэі рэвалюцыйнай салідарнасці народаў.

Поўны глыбокага сэнсу той факт, што ў новай, Народнай Польшчы газета «Трыбуна люду» ў перадавым артыкуле, прысвечаным Адаму Міцкевічу, піша аб ім як аб народным паэце, вяшчальніку рэвалюцыі, барацьбіту за справу еўрапейскага прагрэсу і дружбу паміж усімі народамі

**Дацэнт Д. Е. ФАКТАРОВІЧ.**

> *„... Міцкевіч, Гётэ і Шылер узносіліся вышэй за ўсё тады, калі іх акрыляла творчасць калектыву, калі яны чэрпалі натхненне з вытокаў народнай паэзіі, бязмерна глыбокай, незлічона рознастайнай, моцнай і мудрай“.*
>
> **А. М. ГОРКІ**

## ТРЫБУН НАРОДАЎ

Савецкаму чытачу Адам Міцкевіч вядомы, перш за ўсё, як паэт і грамадскі дзеяч. А між тым, ён доўгі час быў рэдактарам газет «Польскі пілігрым» і «Трыбуна народаў», напісаў такія вострыя публіцыстычныя творы, як «Кнігі народа польскага і пілігрымства польскага», «Гісторыя будучыні», «Гісторыя Польшчы». У сваіх артыкулах Міцкевіч рэзка крытыкаваў буржуазны лад сучасных яму Францыі, Англіі і Злучаных Штатаў Амерыкі, падтрымліваў рэвалюцыйныя выступленні народаў розных краін Еўропы, сцвярджаў, што грамадствам будучага з'явіцца сацыялістычнае грамадства, а шлях да яго ляжыць праз усенароднае паўстанне. Публіцыстычная спадчына вялікага польскага паэта дазваляе нам больш дакладна ўявіць яго філасофскія, сацыяльныя і эстэтычныя погляды.

Вось чаму я рашыў сваё дыпломнае даследаванне прысвяціць тэме «Міцкевіч-публіцыст». Распрацоўка гэтага пытання вельмі складаная, але ў той-жа час і вельмі пачэсная задача. Ні ў рускім, ні ў польскім літаратуразнаўстве няма прац па гэтай тэме. Большая частка публіцыстычных твораў А. Міцкевіча яшчэ не перакладзена на рускую мову. Артыкулы паэта часамі вельмі супярэчлівыя. Улічыўшы ўсё гэта, я пачаў працаваць над дыпломным даследаваннем яшчэ ў канцы мінулага навучальнага года. Вялікую карысць прынесла мне знаёмства са сховішчамі бібліятэкі Вільнюскага універсітэта, дзе калісьці вучыўся паэт. Зараз у мяне сабран значны матэрыял аб публіцыстычнай дзейнасці Адама Міцкевіча, палымянага трыбуна дружбы народаў.

**А. МАЛЬДЗІС.**

**студэнт V курса аддзялення журналістыкі.**

**А. МІЦКЕВІЧ**

## СМЕРЦЬ ПАЛКОЎНІКА

Пад дрымотнаю пушчы ахоўай
Стаў паўстанцаў атрад, спачывае,
А у хаце старой лесніковай
Іх палкоўнік ад ран памірае.
З блізкіх вёсак прыбеглі сяляне,
Пра здароўе з слязамі пытаюць.
Быў, відаць, у вялікай пашане,
Калі ўсе па ім моцна ўздыхаюць.
Перад смерцю палкоўнік жадае
Свайго сябра, каня свайго ўбачыць,
Хто у бойках суровых бывае,
Знае той, што ў іх конь добры значыць.
Загадаў, каб прынеслі і зброю
Ды мундзір не забылі стралецкі,
Развітацца, як трэба герою,
Ён жадае, як мужны Чарнецкі.
Ледзь каня з хаты вывесці ўспелі,
У яе зайшоў-ксёндз для малітвы—
І салдаты ад жалю збялелі,
Як яны не бялелі і ў бітвах.
На'т Касцюшкі старыя салдаты,
Што без слёз сваю кроў пралівалі,
Зараз горка, як дзеці, рыдалі
На каленях усе сярод хаты.
У капліцы адзвонена рана,
Ўдаль дружына паўстанцаў спяшае,
Бо ўжо рускімі лес той забраны,
Труп героя люд бачыць жадае.
Змоўк. На лаве навек спачывае.
Сядло й бурка тут пад галавою.
Ў руках крыж і вінтоўка з сабою.
Хоць палкоўнік ў салдацкім адзенні,
Твар дзявочы... Прыгледзься хвіліну:
Грудзі пышныя... Ах, то-ж дзяўчына,
Што паўстанцаў на бой уздымала,
Гераіня—літоўка ўдалая.

**Пераклад студэнта А. ЛІСА.**

*На адкрытай ва універсітэце выстаўцы, прысвечанай жыццю і творчасці Адама Міцкевіча, экспанаваны рэдкія выданні твораў паэта — фотакопіі рукапісаў паэмы «Пан Тадэуш» і першае выданне гэтага твора на беларускай мове ў перакладзе В. І. Дуніна-Марцынкевіча.*

*На здымку: студэнты з Польскай народнай рэспублікі, якія ў гэтым годзе паступілі ў наш універсітэт, Н. Мукасей, Л. Філіпік і Ш. Раманчук за разглядам рэдкіх выданняў твораў А. Міцкевіча.*

**Фото Г. Прываловіча.**



